артыкулы

**Аляксандр Вабішчэвіч**
(Брэст)

# Культурна-асветніцкая дзейнасць яўрэяў-літвакоў у 20-30-я гг. XX ст. (на прыкладзе заходнебеларускага рэгіёна)*

Распрацоўка тэарэтычных пастулатаў яўрэйскага нацыянальнага адраджэння пачалася яшчэ ў пачатку XX ст. У вытокаў канцэпцыі ідышызму як свецкай яўрэйскай культуры, заснаванай на роднай мове яўрэяў-літвакоў — ідыш, былі відныя грамадскія дзеячы, вучоныя (лідэр Бунда Х. Жытлоўскі, гісторык, прыхільнік „сацыялагічнага падыходу" С. Дубноў і іншыя). На іх думку, у той час галоўнай асновай яўрэйскай нацыянальнай ідэі мог стаць нацыяналізм дыяспары — абуджэнне гістарычнай свядомасці, адзінства гістарычных лёсаў яўрэяў усёй Усходняй Еўропы. Ідыш прызнаваўся фундаментам яўрэйскай нацыянальнай тоеснасці. Ідэолагі ідышызму хацелі правесці ў інтарэсах шырокіх слаёў яўрэйскага насельніцтва дэмакратызацыю адукацыі і культуры, пераўтварыць ідыш з гутарковай мовы ў мову навукі, літаратуры, павысіць яе прэстыж у розных сацыяльных сферах. Дзеячы Бунда падтрымлівалі канцэпцыю ідышызму.

Ідыш з'яўляўся інтэгратыўным фактарам для яўрэяў-літвакоў і ў заходнебеларускіх землях[1]. Гэтая мова займала пануючае становішча ў іх паўсядзённым жыцці, адукацыі, культурным жыцці. Польская мова да пачатку 1920-х гг. сярод яўрэяў не мела вялікіх пазіцый. Боль-

* Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў (Мінск).

[1] О. А. Соболевская, В. В. Гончаров, *Евреи Гродненщины: жизнь до Катастрофы*, Донецк 2005, с. 50.

шай перавагай карысталася руская культура і мова. Для яўрэяў-літвакоў важнае значэнне ў свецкім жыцці мела руская рэвалюцыйна-дэмакратычная літаратура, дасягненні рускай навукі.

Пасля Першай сусветнай вайны яўрэі-літвакі аказаліся раз'яднанымі дзяржаўнымі межамі і апынуліся ў складзе Польшчы, Літвы, Латвіі, Савецкай Расіі. Цяжка назваць дакладную лічбу яўрэйскага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы, бо ў ходзе перапісу 1921 г. вызначалася рэлігійная і нацыянальная прыналежнасць, у 1931 г. — рэлігійная прыналежнасць і родная мова. Акрамя таго, перапіс 1921 г. не ахопліваў Віленшчыны. Моўную прыкмету пры вызначэнні этнічнай прыналежнасці да яўрэйскай супольнасці нельга лічыць вызначальнай. Польскі даследчык Е. Тамашэўскі больш дакладным прызнае вызначэнне па рэлігійнай прыкмеце (носьбітаў іудаізму): у 1921 г. — 2 845,4 тыс. яўрэяў (10,5% усяго насельніцтва), 1931 г. — 3 113,9 тыс. (9,8%), 1939 г. — 3 460 тыс. (9,7%)[2]. У іншай працы Е. Тамашэўскі прапануе шукаць „залатую сярэдзіну" — паміж іудзеямі (іх колькасць ужо прыведзена) і тымі, хто падаваў роднай мовай ідыш ці старажытнаяўрэйскую мову (іўрыт). Гэтых другіх па перапісе насельніцтва 1931 г. налічвалася ў Польшчы 2 млн. 733 тыс. (8,6%)[3]. Зыходзячы з падлікаў па 29 заходнебеларускіх паветах, зробленых даследчыкамі Я. Мірановічам, С. Токцем, Р. Радзікам, колькасць яўрэяў там у 1931 г. (паводле мовы і веравызнання) вагалася адпаведна паміж 342 тыс. (8,3%) і 375 тыс. (9,2%) чалавек[4]. У 8 паветах Палескага ваяводства яўрэі складалі ў 1931 г. 9,2-9,6%, у 5 паветах Беластоцкага — 13,4-13,5%, у Навагрудскім — 7,3-7,8%, у 8 паветах Віленшчыны — 4,1-5,2%[5]. Хаця на тэрыторыі Віленскага ваяводства прысутнасць яўрэяў была нязначнай, аднак у „літоўскім Іерусаліме" — Вільні — яны складалі ў тым жа 1931 г. 28,2% гараджан[6]. Найбольшая канцэнтрацыя яўрэйскага насельніцтва назіралася ў Беластоцкім, Гродзенскім, Брэсцкім, Пінскім паветах. Большая яго частка жыла ў гарадах і мястэчках. У Гродне яўрэяў было 42,6%, у Пінску — 63,4%, у Брэсце — 44,3%. Яўрэі складалі больш 70% насельніцтва Бярозы-Картузскай, Кобрына[7].

[2] *Najnowsze dzieje Żydów w Polsce: W zarysie (do 1950 roku)*, pod red. J. Tomaszewskiego; oprac. J. Adelson i in., Warszawa 1993, s. 158-159.

[3] J. Tomaszewski, *Ojczyzna nie tylko Polaków: Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918-1939*, Warszawa 1985, s. 96- 97.

[4] E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik, *Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku*, Białystok 2005, s. 42-43.

[5] Там жа.

[6] *Najnowsze dzieje Żydów w Polsce...*, s. 161.

[7] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДАБВ), , ф. 1, воп. 1, спр. 2528, арк. 39; спр. 2516, арк. 1.

Становішча яўрэяў у міжваеннай Польшчы было супярэчлівым. З аднаго боку нарасталі сацыяльна-эканамічныя цяжкасці, антысемітызм, з другога — разгортваліся працэсы нацыянальна-культурнага адраджэння яўрэяў, якія нярэдка называюць „постХаскалай" (ПостАдраджэннем), „адаптаванай Хаскалай", што было нацэлена на культуру ідыш. Не прэтэндуючы на ўсёабдымнасць у асвятленні згаданай тэмы, паспрабуем закрануць якраз тыя яе аспекты, якія звязаны найперш з захаваннем і развіццём культуры ідыш. Культурна-асветніцкая дзейнасць сіяністаў арганізацый не будзе асвятляцца.

Стварэнне свецкай яўрэйскай нацыянальнай культуры на ідыш з'яўлялася своеасаблівым эксперыментам, сур'ёзным аргументам на карысць яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі[8]. Нягледзячы на адсутнасць ва ўрадавых колах міжваеннай Польшчы адзінства адносна яўрэйскага пытання, усе польскія палітычныя лагеры былі праціўнікамі яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі[9].

Ужо з пачатку 1920-х гг. пачала складвацца сетка яўрэйскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў. Адным з уплывовых стала Цэнтральная яўрэйская школьная арганізацыя (ЦЯША) — Centrale Jidisze Szuł-Organizacje (CISzO), што была ўтворана у Варшаве ў канцы 1921 г. Галоўнай яе задачай было ўтварэнне свецкіх школ „без нацыяналізму, клерыкалізму", з выкладаннем на ідыш. У гэтай арганізацыі пераважалі ўплывы Бунда і Паалей Цыён. Легалізавалася таксама арганізацыя Аб'яднанне яўрэйскіх школ (АЯШ). На працягу 1920-х гг. аддзелы АЯШ узніклі ў многіх гарадах і мястэчках заходнебеларускіх зямель. У Палескім ваяводстве ў 1924 г. было 9 аддзелаў АЯШ (каля 800 чалавек)[10]. Лідэры АЯШ выступалі за новую школу, свабодную ад нацыяналістычнага і рэлігійнага ўплыву. Аднак гэтыя дзве культурна-асветніцкія арганізацыі фактычна з'ўляліся прапагандысцкімі асяродка-

[8] E. Mendelsohn, *Żydzi Europy Środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym*, Warszawa 1992, s. 97.

[9] Больш падрабязна гл.: A. Chojnowski, *Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921-1939*, Wrocław – Warszawa – Kraków 1979, ss. 262; J. Tomaszewski, *Ojczyzna nie tylko Polaków…*; tenże, *Zarys dziejów Żydów w Polsce w latach 1918-1939*, Warszawa 1990, ss. 114; *Polska – Polacy – Mniejszości narodowe. Polska myśl polityczna XIX i XX wieku*, pod red. W. Wrzesińskiego, t. 8, Wrocław 1992, ss. 421; B. Halczak, *Cele polityki endeckiej wobec mniejszości żydowskiej w Polsce w latach 1919-1939*, „Biuletyn Żydowskiego Instytutu Historycznego – Instytutu Naukowo-Badawczego", 1995 , nr 3 – 1996, nr 2 (175 - 178), ss. 37 - 47; J. Wołkonowski, *Stosunki polsko-żydowskie w Wilnie i na Wileńszczyźnie 1919-1939*, Białystok 2004, ss. 463 і іншыя.

[10] ДАБВ , ф. 1, воп. 9, спр. 1183, арк. 23.

мі Бунда[11]. Школы ЦЯША павінны былі навучаць і выхоўваць моладзь у сацыялістычным духу, г.зн. уяўляць сабой новы від „яўрэйскай свецкай школы сацыялістычнага тыпу”. Галоўнымі мэтамі ЦЯША з’яўляліся наступныя: выхаванне моладзі ў духу яўрэйскай нацыянальнай культуры, пашырэнне ідэй сацыялізму, прывіццё моладзі нерэлігійнага ўспрыняцця навакольнага свету. Адукацыя павінна мець свецкі характар, акцэнт рабіўся на выкладанне прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін[12]. Установы ЦЯША супрацьпастаўляліся хедэрам. Як сіяністы, так і сацыялісты імкнуліся ствараць арганізацыі, якія былі б пазбаўлены шматлікіх забарон і абмежаванняў традыцыйнага іудаізму, падтрымлівалі родную мову — паўсядзённы ідыш.

Пераважная большасць школ ЦЯША размяшчалася на заходнебеларускіх землях з-за спрыяльнай этнакультурнай атмасферы для яўрэйскага жыцця[13]. Пад уплывам закону ад 31 ліпеня 1924 г. паскорыўся працэс стварэння школ ЦЯША. У лістападзе 1924 г. была праведзена школьная акцыя ў Брэсце — наладжаны вулічны збор ахвяраванняў для яўрэйскіх школ, прыём у культурна-асветніцкую арганізацыю новых сябраў[14]. У час праведзенай прапагандысцкай акцыі яўрэі-літвакі станоўча рэагавалі на пашырэнне школ з выкладаннем на ідыш. Так, на такую лекцыю ў Слоніме сабралася каля 2 тыс. чалавек[15].

У асноўным адкрываліся 7-класныя яўрэйскія пачатковыя школы. Вучэбныя праграмы гэтых школ былі вельмі насычанымі. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню ідыш, а таксама польскай мовы[16]. Вывучалі таксама прыродазнаўства, геаграфію і гісторыю, матэматыку, маляванне, спевы, фізкультуру. Па жаданню вывучаўся і іўрыт — з 3-га класа. Дзеці на ўроках працы асвойвалі дамаводства, сталярную справу, садаводства. У канцы 1925 г. у заходнебеларускім рэгіёне дзейнічала 91 пачатковая школа, 3 гімназіі, 2 настаўніцкія семінарыі і каля 20 дзіцячых дамоў, што кантраляваліся ЦЯША. Усяго ў Польшчы ў 1927/1928 навучальным годзе ў шко-

[11] А. В. Мощук, *Еврейские культурно-просветительские организации на территории Западной Беларуси (1921-1939 гг.)*, [у:] *Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6 - 7 снежня 2001 г.)*, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Беларуская асацыяцыя гісторыкаў, У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч, Мінск 2001, с. 245.

[12] *Najnowsze dzieje Żydów w Polsce...*, s. 246.

[13] E. Mendelsohn, *Żydzi Europy Środkowo-Wschodniej...*, s. 99.

[14] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей: ДАГВ), ф. 662, воп. 3, спр. 6, арк. 521.

[15] Там жа, арк. 735.

[16] „Sprawy Narodowościowe” 1937, nr 6, s. 668.

лах ЦЯША вучылася каля 13,5 тыс. чалавек[17]. З-за рэпрэсіўных дзеянняў польскіх уладаў крыху запаволіўся прыток яўрэйскіх дзяцей у школы і іншыя ўстановы. Аднак усё-такі ў 1928/1929 навучальным годзе ЦЯША ўтрымлівала па ўсёй краіне шэраг розных навучальных устаноў — 114 пачатковых школ, 3 гімназіі, 1 настаўніцкую семінарыю, 52 вячэрнія школы, а таксама 46 дзіцячых садкоў (больш 24 тыс. дзяцей)[18].

Састаўной часткай ЦЯША была арганізацыя Цэнтральны камітэт па адукацыі (ЦКА) з сядзібай у Вільні, створаная левым крылом ідышысцкага руху. У склад кіраўніцтва ЦКА ўваходзілі старшыні Г. Каварскі, Ц. Шабад, А. Розенталь, а таксама Б. Каган, І. Чэрніхаў, І. Арановіч і іншыя[19]. У пачатковых школах ЦКА ў 1938 г. было 1 283 вучні, а ва ўсіх навучальных установах — 2 183 чалавекі[20]. Ц. Шабад адстойваў ідэю яўрэйскай нацыянальна-культурнай аўтаноміі не толькі ў ЦЯША і ЦКА, але і ў органах гарадскога самакіравання Вільні, у польскім сейме, куды быў выбраны ў 1928 г.

З пачатку 1930-х гадоў назіраўся заняпад школ ЦЯША. Негатыўныя вынікі сусветнага эканамічнага крызісу падарвалі матэрыяльную базу школ, прывялі да банкруцтва школьную выдавецка-паліграфічную справу. Да 1934 г. засталося толькі 68 школ ЦЯША на тэрыторыі заходнебеларускага краю. Толькі ў пачатку 1935 г. назіралася некаторае ажыўленне дзейнасці ЦЯША, выкліканае агульным уздымам рабочага руху ў Польшчы. Усяго ў 1934/1935 навучальным годзе ЦЯША ахоплівалі прыкладна 10 тыс. дзяцей[21] (па іншых ацэнках — 15,5 тыс. вучняў[22]). У 1935 г. у заходнебеларускім рэгіёне знаходзілася 169 розных адукацыйных і выхаваўчых устаноў, з іх 11 дзіцячых дамоў (320 чалавек), 86 пачатковых школ (9 936 вучняў), 2 гімназіі — у Вільні і Беластоку (650 школьнікаў), 65 вячэрніх школ (4 350) навучэнцаў), 5 дзённых школ (230 вучняў)[23]. Нягледзячы на гэта, значная частка яўрэйскай моладзі не была ўцягнута ў школы ЦЯША. Не спраўдзіліся спадзяванні на стварэнне новай (свецкай) яўрэйскай культуры. Значная частка яўрэйскай пра-

[17] „Sprawy Narodowościowe” 1929, nr 2, s. 296.
[18] „Sprawy Narodowościowe” 1932, nr 5, s. 513; *Najnowsze dzieje Żydów w Polsce…*, s. 246.
[19] Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (далей: ЦДАЛ), ф. 53, воп. 23, спр. 1764, арк. 3, 9, 11, 17, 33, 40, 41.
[20] Там жа, арк. 8.
[21] „Sprawy Narodowościowe” 1937, nr 6, s. 667.
[22] S. Mauersberg, *Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918-1939*, Wrocław – Warszawa – Kraków 1968, s. 167.
[23] ДАГВ, ф. 88, воп. 1, спр. 22, арк. 9; „Sprawy Narodowościowe” 1937, nr 6, s. 669-700.

летарскай моладзі вымушана была вучыцца ў польскіх дзяржаўных школах ці яўрэйскіх рэлігійных установах. Акрамя жорсткай нацыянальнай палітыкі польскіх урадаў, сярод прычын падзення колькасці школ ЦЯША трэба вылучыць узмацненне аўтарытарызму ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы ў першай палове 1930-х гг., заняпад сацыял-дэмакратычнага руху (найперш Бунда), негатыўныя вынікі эканамічнага крызісу, якія прывялі да збяднення яўрэйскіх працоўных, дзеці якіх і складалі большасць вучнёўскага кантынгента. Тым не менш, у справе стварэння яўрэйскіх навучальных устаноў ЦЯША з'яўлялася другой нацыянальнай арганізацыяй пасля сіяніцкай Тарбут. У 1936/1937 навучальным годзе агульная колькасць вучняў у школах ЦЯША на тэрыторыі Заходняй Беларусі дасягнула 17 тыс. дзяцей.

У міжваенны час у межах польскай дзяржавы разгарнула сваю дзейнасць яшчэ адна яўрэйская культурна-асветніцкая арганізацыя — Культур-Ліга (створаная ў 1922 г. паводле пагаднення паміж Бундам, Паалей Цыёнам, Ферайнігтэ на аснове існуючай яшчэ з 1917 г. Лігі пралетарскай культуры). Спачатку ставілася мэта — пашыраць у асяроддзі яўрэйскіх працоўных мас ідэю аб перабудове існуючага грамадскага ладу ў духу пралетарскай культуры, потым — падтрымліваць развіццё культуры ідыш, нягледзячы на ідэйна-палітычныя разыходжанні[24]. Да канца 1920-х гг. у заходнебеларускім рэгіёне была створана сетка структурных адзінак гэтай арганізацыі. У Палескім ваяводстве налічвалася каля 30 аддзелаў Культур-Лігі — у Брэсце, Пінску, Кобрыне, Пружанах, Дамачаве, Бярозе, Століне і Давыд-Гарадку[25]. На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства вылучаліся Навагрудак, Шчучын, Баранавічы, Нясвіж, Мір, Ліда, Быцень, Слонім, у Беластоцкім — Беласток, Гродна, Ваўкавыск, Гарадок і Крынкі (у красавіку 1939 г. у Беластоцкім ваяводстве дзейнічала 7 аддзелаў Культур-Лігі[26]). Акрамя лекцый наладжваліся вечары, тэатральныя прадстаўленні, музычна-канцэртныя праграмы.

З 1928 г. стварэннем школ з выкладаннем на ідыш і іўрыце займалася таварыства Шуль-Культ (Школьны і культурны саюз — Szul und Kultur Farband, скарочана: Szul-Kult), куды ўваходзілі прадстаўнікі розных груп сіяністаў, Паалей Цыён-правіцы, людоўцы. Гэта была своеасаблівая рэакцыя на неадназначнае ўспрыняцце мясцовым яўрэйскім насельніцтвам сіяніцкіх ідэй і іўрыта. У адрозненне ад школ ЦЯША, у школах Шуль-Культа асноўная ўвага надавалася вывучэнню іудаікі. Так, гісторыя яўрэяў падавалася не

[24] Там жа, ф. 2, воп. 2, спр. 917, арк. 106, 186.
[25] Там жа, ф. 1, воп. 10, спр. 139, арк. 16.
[26] Дзяржаўны архіў у Беластоку, ф. 47, сігн. 121, арк. 49.

ў межах усеагульнай гісторыі, а асобным прадметам. Іўрыт вывучаўся не з 3-4 класаў, а з першага. Сіяністы ў сваёй палітычнай прапагандзе востра крытыкавалі бундаўскае АЯШ. У праграму школ Шуль-Культа ўвялі палясціназнаўства, яўрэйскую дэмаграфію. Таварыства Шуль-Культ не здолела разгарнуць шырокай сеткі ўстаноў адукацыі — у 1934/1935 навучальным годзе ўтрымлівала 23 установы рознага тыпу (з іх толькі 10 школ (2,1 тыс. вучняў)[27] — найперш з-за супрацьдзеяння польскіх уладаў. Калі да школ з польскай мовай і іўрыт яны адносіліся лаяльна, то да школ, дзе выкладанне было на ідыш і іўрыце — непрыхільна. Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы матывавала свае жорсткія дзеянні адносна гэтых школ тым, што яны быццам не маюць папулярнасці сярод яўрэйскага насельніцтва.

Заходнебеларускія камуністы непрыхільна ставіліся да яўрэйскіх палітычных партый і падкантрольных ім культурна-асветніцкіх арганізацый. У лісце „Нашы адносіны да школ ЦЯША” (1933 г.) кіраўніцтвам КПЗБ былі дадзены неабгрунтаваныя ацэнкі дзейнасці гэтай бундаўскай культурна-асветніцкай арганізацыі. Заснаваныя ёй школы разглядаліся як „сацыял-фашысцкія”, неяўрэйскія (бо там выкладалася рэлігія), рэакцыйныя (дзе „малейшая іскра рэвалюцыйнасці падаўляецца ў корані сацыял-фашысцкім бундаўска-пэцэкоўскім [Паалей Цыён — А. В.] кіраўніцтвам”). Хоць пацвярджалася непрыняцце і барацьба супраць нацыянальнага прыгнечання беларусаў, украінцаў, літоўцаў, яўрэяў з боку польскіх уладаў, аднак прызнавалася, што „барацьба супраць закрыцця яўрэйскай настаўніцкай семінарыі ў Вільні (...) ні ў якім выпадку не азначае барацьбу ў падтрымку ЦЯША”. У адрозненне ад гурткоў Таварыства беларускай школы і ўкраінскай Просвіты, структурныя адзінкі ЦЯША не прызнаваліся. „ЦЯША не з’яўляецца масавай арганізацыяй. Яна не дапускае рабочых у кіраўніцтва школамі, а накіроўвае туды сваіх людзей, адданых сацыял-фашызму, Бунду”. Падкрэслівалася „контррэвалюцыйная роля ЦЯША ў барацьбе супраць рэвалюцыйных настрояў у школах і выдаленні адтуль рэвалюцыйных элементаў”[28].

Праграмныя ўстаноўкі КПЗБ былі выкладзены ў асобным „Цыркуляры аб яўрэйскай рабоце”. Прыводзім ассобныя вытрымкі з гэтага дакумента. „Павінна весціся безупынная барацьба супраць сацыял-здраднікаў і нацыяналізму ў яўрэйскім рабочым асяроддзі, барацьба супраць бундызму і сіянізму ва ўсіх яго адценнях, супраць

[27] *Najnowsze dzieje Żydów w Polsce...*, s. 247.

[28] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 242, воп. 1, спр. 299, арк. 230.

духавенства і артадоксаў. Патрэбна скончыць з часта сустракаемай лёгкадумнасцю і недаацэнкай сіл праціўніка. (...) Павінна весціся шырокая кампанія супраць духавенства і яўрэйскіх абшчын. Фашызм, выкарыстоўваючы яўрэйскае духавенства разам з духавенствам іншых рэлігій (беларусізацыя царквы) як апору для ўмацавання свайго панавання над масамі, яшчэ больш пашырыў іх правы і замацаваў іх уладу над яўрэйскімі працоўнымі масамі (падтрымка рэлігійных школ, рэлігійных абшчын, кашэрная кухня для яўрэйскіх салдатаў). (...) Трэба на кожным кроку — на прыкладзе іх дзейнасці і ўчынкаў як у агульнакраёвым, так і мясцовым маштабе — выкрываць усе грамадскія, палітычныя, гаспадарчыя, культурныя і іншыя арганізацыі (яўрэйскі сямейны клуб, кааператыўныя таварыствы, школьныя таварыствы, гарадскія самакіраванні, абшчынныя саветы), паказваючы іх сапраўдны класавы характар, іх варожасць інтарэсам яўрэйскіх працоўных мас. (...) Неабходна праводзіць шырокую растлумачальную працу сярод яўрэйскіх працоўных мас, указваючы на дасягненні ў сферы каласальнай гістарычнай працы па рэканструкцыі сярод яўрэйскіх мас у краіне Саветаў, новыя сотні тысяч яўрэйскіх рабочых у прамысловасці, землеўпарадкаванне, дзесяткі тысяч яўрэйскіх школ, яўрэйскіх універсітэтаў, яўрэйскія суды, яўрэйскія Саветы, удзел яўрэйскіх працоўных мас у агульным будаўніцтве сацыялізму”[29]. Вылучэннем лозунгаў з патрабаваннямі аб дзяржаўнай школе на роднай мове вучняў, супраць урадавага антысемітызму, нацыянальнага прыгнёту, апалагетыкай становішча яўрэяў у СССР і г.д. планавалася „вырваць яўрэйскія працоўныя масы з абдымкаў буржуазіі і сацыяльных здраднікаў”[30].

У рамках ажыццяўлення новай стратэгіі і тактыкі, распрацаваных VII кангрэсам Камінтэрна, КПЗБ імкнулася перагледзець свае адносіны да яўрэйскага пытання. Былі самакрытычна (адначасова і суб’ектыўна) прааналізаваны памылкі, пралікі камуністаў: „нігілістычныя адносіны цэлага шэрагу арганізацый да яўрэйскага пытання”, „хвасцісцкія адносіны цэлага шэрагу арганізацый і таварышаў (асабліва ў Вільні) да яўрэйскай школьнай арганізацыі ЦЯША”. Галоўная мэта перад камуністамі была пастаўлена такая: „заваяваць большасць яўрэйскіх рабочых для камунізму”[31]. Прадугледжвалася таксама разгарнуць змаганне супраць „контррэвалюцыйнай, паланізатарскай” яўрэйскай рэлігійнай гміны.

У міжваенны час ранейшыя ўплывы рускай культуры ў асяроддзі яўрэяў змяняліся ўплывамі польскай культуры, мовы. Гэта бы-

[29] Там жа, спр. 298, арк. 17-19.
[30] Там жа, арк. 20.
[31] Там жа, арк. 25-26, 28.

ло вынікам уздзеяння сістэмы асветы (найперш польскіх школ, а таксама яўрэйскіх, дзе вывучалася польская мова і г. д.). Хаця пачала развівацца і свецкая культура, адукацыя розных напрамкаў, аднак асіміляцыйныя працэсы сярод яўрэяў былі слабымі. Захаванню іх нацыянальна-культурнай самабытнасці спрыяў іудаізм. Супольнасць яўрэяў-літвакоў нават ва ўмовах мадэрнізацыі грамадства працягвала захоўваць сваю рэлігійнасць. Рэлігійныя каштоўнасці заставаліся фундаментам яўрэйскай культуры, хоць і тлумачыліся па-новаму. Нацыянальна-культурная аснова захоўвалася пры акцэнце на інтарэсы і каштоўнасці асобы[32].

Яўрэйская рэлігійная адукацыя складалася з 4-х тыпаў школ: хедэраў, талмуд-тораў, школ Бет-Якаў для дзяўчат і іешыў (ешыботаў) для хлопцаў. Яўрэйскія рэлігійныя школы садзейнічалі распаўсюджванню іудаізму сярод яўрэйскага насельніцтва. Гэтыя школы павінны былі выхоўваць дзяцей паводле іудзейскіх традыцый, даць неабходныя свецкія веды. Рэлігійныя прадметы выкладаліся на ідыш ці іўрыце па ўласных праграмах, свецкія — па-польску ў адпаведнасці з праграмай, якая была створана для гэтых школ і зацверджана 13 верасня 1922 г. міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы[33]. Хедэры спрадвеку існавалі ў мястэчках і прызначаліся найперш для незаможнага яўрэйскага насельніцтва. У канцы XIX ст. у гэтых школах атрымоўвалі адукацыю амаль 90% яўрэяў беларускіх зямель[34]. Паступова хедэры сталі недаступнымі для большасці яўрэйскай моладзі. Іх утрыманнем займаліся яўрэйскія гміны, зрэдку палітычныя партыі (Агудат Ісраэль) і грамадскія арганізацыі.

Хедэры з'яўляліся яўрэйскімі пачатковымі рэлігійнымі школамі, куды прымалі дзяцей з 5 гадоў, хоць гэтага строга не прытрымліваліся. Навучанне там цягнулася 8 гадоў. Настаўнікі (меламеды) вучылі пісаць, лічыць, выкладалі рэлігійныя прадметы. У 1920-я гг. праграма навучання хедэраў была зменена — уведзены свецкія прадметы. У вялікіх мястэчках і гарадах у навучальных планах хедэраў былі як рэлігійныя (рэлігія, Біблія, Талмуд, іўрыт і ідыш), так і свецкія прадметы (польская мова, гісторыя, прыродазнаўства, геаграфія, матэматыка). Таму вучні такіх школ вызваляліся ад наведвання дзяржаўных агульнаадукацыйных школ. У Пінску такімі ўста-

[32] О. А. Соболевская, В. В. Гончаров, *Евреи Гродненщины*, с. 328 - 329.

[33] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 623, арк. 2.

[34] А. Баранава, *Да пытання аб гісторыі адукацыі яўрэяў у Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў*, [у:] *Беларусіка-Albaruthenica*, кн. 4: *Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння*, рэд В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека, Мінск 1995, с. 77.

новамі былі прыватная рэлігійная школа Хорэў і мужчынская рэлігійная школа Тушыя[35]. Польскую мову пачыналі вывучаць з першага класа. Заняткі пачыналіся з чытання малітваў. Сусветная гісторыя выкладалася ў лагічнай паслядоўнасці. Гэта яскрава відаць на прыкладзе школы Хорэў у Пінску: першы год навучання — гісторыя славян (да канца XVIII ст.), другі год — ад напалеонаўскіх войнаў да Новага часу, трэці год — гісторыя Усходу ад старажытнасці да Новага часу, чацвёрты год — Новая гісторыя (адначасова вывучалася гісторыя Польшчы гэтага часу), пяты год — заканчвалася вывучэнне Новага часу і гісторыя ІІ Польскай Рэспублікі[36]. У малых населеных пунктах у хедэрах і талмуд-торах не вывучаліся свецкія прадметы, таму вучні абавязаны былі наведваць дзяржаўныя агульнаадукацыйныя школы.

У адрозненне ад хедэраў, у талмуд-торах трохі больш увагі надавалі вывучэнню свецкіх прадметаў. Акрамя таго, у талмуд-торах рэлігійныя прадметы вывучаліся на іўрыце (у хедэрах — на ідыш). Па свайму ўзроўню яны стаялі вышэй за хедэры. З 1929 г. талмуд-торы падпарадкоўваліся арганізацыі Хорэў. У Пінску дзейнічалі 2 талмуд-торы: 2-класная (навучалася да 200 вучняў) і 4-класная мужчынская (больш 120 вучняў). Усяго ў Пінску дзейнічала 5 яўрэйскіх рэлігійных школ[37]. У Гродне функцыянавалі 2 талмуд-торы, хаця ў 1924 г. польскія ўлады спрабавалі спыніць дзейнасць адной са школ быццам па просьбе нешматлікай групы яўрэяў, якая жадала польскай школы. Распарадак дня можна прасачыць на прыкладзе талмуд-торы № 1 г. Гродна. Дзеці праводзілі ў талмуд-торы амаль увесь дзень. Да абеду праходзілі заняткі, у другой палавіне дня адбываліся чытанні, дыскусіі, гульні. Сярод прадметаў былі Біблія, гісторыя яўрэяў, іўрыт, ідыш, польская мова, рэлігійныя спевы, гісторыя Польшчы, арыфметыка і геаметрыя, геаграфія, прыродазнаўства, маляванне, гімнастыка[38]. У 1928 г. у гэтай школе працавалі 12 настаўнікаў, якія навучалі 309 юнакоў і дзяўчат. У школьнай бібліятэцы было больш 1 тыс. кніг на польскай мове, ідыш і іўрыце[39].

Адной з формаў пазашкольнай працы ў талмуд-торы № 1 г. Гродна былі экскурсіі, у тым ліку і краязнаўчыя (у Вільню і іншыя гарады). У школе дзейнічалі розныя гурткі. Тэатральны гурток названай школы нярэдка паказваў спектаклі ў гарадскім тэатры. Хоць

[35] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 623, арк. 1; спр. 652, арк. 2.
[36] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 623, арк. 6-7.
[37] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 652, арк. 5, 8, 26; спр. 695, арк. 15; спр. 703, арк. 3; воп. 4, спр. 688, арк. 2; ф. 310, воп. 3, спр. 140, арк. 4.
[38] ДАГВ, ф. 56, воп. 1, спр. 37, арк. 83.
[39] ДАГВ, ф. 56, воп. 1, спр. 55, арк. 46; спр. 62, арк. 191.

школа мела ўласны будынак, узведзены яшчэ ў 1895 г., аднак матэрыяльнае становішча было складаным. Пераважная большасць вучняў школы паходзіла з незаможных сем'яў. У канцы 1931/1932 навучальнага году з 598 вучняў сацыяльны склад іх бацькоў быў наступны: рабочыя — 103, краўцы — 92, шаўцы — 62, фурманы — 60, рамеснікі — 54, гандляры — 45, насільшчыкі — 42, столяры — 33, маляры — 26, дактары — 25 і некалькі чалавек іншых прафесій[40]. Частка дзяцей з найбольш незаможных сем'яў вызвалялася ад платы за навучанне. Школьны бюджэт на 1931/1932 навучальны год планаваўся ў памеры 39 875 злотых. Усе выдаткі планавалася пакрыць не толькі за кошт аплаты вучняў (8 775,5 злотых), але і пры падтрымцы яўрэйскай абшчыны (9 000 злотых), субсідый гарадскога магістрату (2 2000 злотых)[41]. Такі бюджэт распрацоўваўся на падставе падыходаў, якіх прытрымліваліся мясцовыя польскія ўлады да 1932 г. Да гэтага часу 6 яўрэйскіх школ Гродна (талмуд-тора № 1, талмуд-тора № 2, школа Мідраша-Тарбут, школа Тора Эмэс, школа ЦЯША, школа таварыства Яўнэ), у якіх вучылася 1 800-1 900 дзяцей, атрымлівалі ад гарадской управы субсідыі ў памеры 75-80 тыс. злотых[42]. Вучні карысталіся паслугамі бібліятэк з літаратурай на ідыш і іўрыце, што існавалі пры Гродзенскай яўрэйскай абшчыне і мясцовым цэнтры сіяніцкіх партый і арганізацый[43].

Матэрыяльна-тэхнічная база яўрэйскіх рэлігійных школ была слабой. Так як усе гэтыя школы былі прыватнымі, то яны залежалі ад платы за навучанне, субсідый магістратаў, якія ўвесь час змяншаліся, ахвяраванняў мясцовага яўрэйскага насельніцтва. Так, у Пінску большасць рэлігійных школ яўрэяў размяшчалася ў памяшканнях, якія не былі прыстасаваны для вучэбна-выхаваўчага працэсу, ці ў розных будынках. 8-класная мужчынская школа Тушыя размяшчалася ў 3-х будынках на розных вуліцах[44]. Востра адчуваўся недахоп падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў. У школе Хорэў у бібліятэцы налічвалася ўсяго 75 кніг на 120 вучняў[45]. Не выконваліся таксама санітарна-гігіенічныя нормы. Многія настаўнікі гэтых школ дрэнна ведалі польскую мову.

Выдаткі на асвету займалі значнае месца ў гадавым бюджэце яўрэйскіх кагалаў. Аднак у крызісныя перыяды кагалы звярталіся за пад-

[40] Там жа, спр. 63, арк. 125-126.
[41] Там жа, арк. 132.
[42] Там жа, арк. 253.
[43] Там жа, спр. 74, арк. 93. Дакумент з гэтай архіўнай справы са спісам яўрэйскіх арганізацый Гродна поўнасцю быў апублікаваны ў зб.: *Евреи Беларуси: История и культура*, Минск 1998, вып. 3-4, с. 218-222.
[44] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 652, арк. 26.
[45] Там жа, спр. 623, арк. 36адв.

трымкай да шырокай яўрэйскай грамадскасці. У 1924 г. на сходзе членаў Таварыства аб'яднаных яўрэйскіх школ у Брэсце было вырашана для выратавання нацыянальнай асветы звярнуцца да працоўных горада ахвяраваць палавіну дзённага заробку, а да гандляроў і рамеснікаў — 5 злотых[46]. Для збору сродкаў на патрэбы яўрэйскіх школ сярод мясцовага насельніцтва было наладжана тэатральна-музычнае прадстаўленне ў Слоніме[47]. У 1927 г. абшчына ў Гродне арганізавала збор ахвяраванняў для падтрымкі настаўніцкіх курсаў і курсаў па ліквідацыі непісьменнасці дарослых. Пасля таго, як не ўдалося прабіцца на дзяржаўныя настаўніцкія курсы, для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў яўрэйскіх школ горада былі адкрыты ў снежні 1926 г. свае курсы, якія наведвала каля 60 чалавек. Кіраўніком курсаў быў дырэктар талмуд-торы № 1 г. Гродна Ш. Бадылькес, лектарамі — вопытныя настаўнікі мясцовых школ[48]. З 1932/1933 навучальнага года магістрат Гродна ўхіліўся ад ранейшых выплат на вывучэнне польскай мовы і асобных прадметаў па-польску. На гэты навучальны год магістрат выдзеліў яўрэйскім школам 65 554 злотых, аднак гарадская рада зменшыла гэтую суму да 64 005 злотых, што было менш на 11 675 злотых, чым у папярэднім годзе. У рэальнасці атрымалі толькі 54 000 злотых[49]. У сакавіку 1933 г. кіраўнікі ўсіх яўрэйскіх школ Гродна, у якіх вучылася больш 2 тыс. дзяцей, выступілі з разгорнутым лістом, у якім пратэставалі супраць ігнаравання нацыянальна-культурных інтарэсаў мясцовага яўрэйскага насельніцтва. „Яўрэйскае насельніцтва разглядае гэта як глыбокую крыўду і замах на сваё школьніцтва (...). Яўрэйскае грамадства, нягледзячы на цяжкі крызіс і на тое, што разам з усімі грамадзянамі Польшчы нясе на сваіх плячах увесь гадавы цяжар, не карыстаецца паслугамі бясплатнай грамадскай школы, хаця забяспечвае патрабаванні і жаданні яўрэяў у галіне нацыянальнага выхавання і клопату пра нацыянальную культуру"[50]. Складанае фінансавае становішча школ прывяло да ўзнікнення праблемы запазычвання зарплаты. У кастрычніку-лістападзе 1933 г. акруговы і гарадскі суд у Гродне задаволілі адпаведныя іскавыя заявы настаўнікаў талмуд-торы № 1 г. Гродна Ц. Штэйн і Ф. Азгут да кіраўніцтва навучальнай установы[51].

Аднак матэрыяльнае становішча яўрэйскіх школ Гродна працягвала пагаршацца. У 1935/1936 навучальным годзе асігнаванні ад га-

[46] ДАГВ, ф. 662, воп. 3, спр. 6, арк. 243.
[47] Там жа, спр. 9, арк. 200.
[48] Там жа, ф. 56, воп. 1, спр. 14, арк. 31; спр. 46, арк. 3, 72; спр. 37, арк. 70адв.
[49] Там жа, спр. 63, арк. 141, 146, 257.
[50] Там жа, арк. 147.
[51] Там жа, арк. 157, 172.

радской управы зменшыліся да 33 000 злотых, хаця колькасць вучняў дасягнула 2 300, а ў 1936/1937 г. — 25 000 злотых[52]. Асноўны цяжар па ўтрыманню яўрэйскіх школ прыходзіўся на кагал. Гэта відаць яскрава на прыкладзе бюджэтных паказчыкаў талмуд-торы № 1. У 1935/1936 навучальным годзе школа мела наступныя памеры прыбытку (у дужках пададзены запланаваныя): субсідыі гарадской управы — 7 261,5 злотых (11 000 злотых), плата за вучобу ад бацькоў вучняў — 4 688,9 злотых (6 000 злотых), дапамога яўрэйскай абшчыны — 10 151 злоты (7 120 злотых). У 1936/1937 навучальным годзе гэтыя паказчыкі былі адпаведна 8 678 (9 000), 4 239,2 (6 000), 87 726 (10 980), у 1937/1938 навучальным годзе — 5 197,5 (8 500), 3 306,4 (5 000), 164 978,6 (10 139)[53]. Па-першае, гэтая статыстыка сведчыць аб тым, што яўрэйскі кагал вымушаны сам пакрываць нявыкананыя гарадскімі ўладамі фінансавыя абавязацельствы, па-другое, паказвае неплацежаздольнасць яўрэйскага насельніцтва, якое моцна пацярпела ад эканамічнага крызісу 1929-1933 гг.

У іешывах (ешыботах) рыхтавалі рабінаў, знаўцаў Талмуда. У іх прымалі хлопцаў, выпускнікоў хедэраў і талмуд-тораў з 13-гадовага ўзросту. Вывучаліся толькі рэлігійныя прадметы. Ешыботы спрыялі складванню інтэлектуальнай яўрэйскай эліты. Нягледзячы на сацыяльнае становішча і паходжанне, перад кожным навучэнцам ешыбота адкрываўся нялёгкі шлях на вяршыню вучонасці. Шматлікія ешыботы падпарадкоўваліся арганізацыі Хорэў, створанай Агудат Ісраэль.

У адрозненне ад малых іешыў (ktana), якія з'яўляліся сярэднімі навучальнымі ўстановамі, былі і вялікія ешыботы (gdola), якія лічыліся вышэйшымі ўстановамі. Найбольш славутай такой установай была іешыва ў Міры, якая была заснавана яшчэ ў 1815 г. купцом і талмудыстам Самуілам Цікцінскім. Найбольшую славу ў свеце яна набыла ў пачатку XX ст., калі яе ўзначаліў талмудыст, рабін Эліэзэр Егуда Фінкель. Іешыва не мела ўласнага інтэрнату, таму студэнты вымушаны былі жыць на прыватных кватэрах. Студэнцкі кантынгент налічваў каля 400 чалавек, з якіх большасць паходзіла з заходнебеларускіх зямель і іншых рэгіёнаў польскай дзяржавы. Каля чвэрці навучэнцаў складала моладзь з ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Бельгіі, Францыі і іншых еўрапейскіх краін, а таксама Паўднёвай Афрыкі[54].

[52] Там жа, арк. 253.

[53] Там жа, арк. 236адв., 289, 335.

[54] Паводле апублікаваных у 1989 г. успамінаў рабіна Т. Льюіса з г. Дубліна (Ірландыя) (вучыўся ў Мірскім ешыбоце ў 1935-1939 гг.), урыўкі якіх змешчаны на сайце: http://arkwing.uoregon.edu/~rkimble/Mirweb/Mir1.html; А. Фрыдман, *Лёс мірскай ешывы*, „ARCHE” 2000, № 3 (8); *Żydzi w Polsce. Dzieje i kultura. Leksykon*, redakcja J. Tomaszewski, A. Żbikowski, Warszawa 2001, s.194.

Некаторыя з іх прыехалі ў Мірскую ешыву паглыбляць свае веды ў галіне іудаікі пасля сканчэння універсітэтаў. Выхаванцы ешывы, яе выпускнікі і вядомыя рабіны з ўсёй Польшчы прыязджалі ў Мір напярэдадні яўрэйскага Новага года Рош-ха-Шана. Навучэнцы ешывы паказвалі тэатралізаванае прадстаўленне, танцы, спевы на свята Сімхат-Тора.

У міжваенны час працягвала дзейнічаць іешыва ў Валожыне, якая з'яўлялася самай ранняй ешывай не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ўсёй Усходняй Еўропы (заснавана яшчэ ў 1803 г. Хаімам бен Іцхакам Валожынерам (Валожынскім), атрымала ў яго гонар назву Эц хаім —Дрэва Хаіма)[55]. З іншых вядомых іешыў трэба адзначыць іешывы ў Вільні, Беластоку, Клецку, Слуцку, Баранавічах, Брэсце, Пінску, Кобрыне, Навагрудку, Гродне. Навучанне ў іешывах было бясплатным. Для падтрымкі навучэнцаў з незаможных сем'яў у гродзенскай іешыве Шаарэй Тора ў 1935 г. была заснавана стыпендыя імя Ховеца Хаіма (рабіна І.-М. Кагана)[56]. Пасля антысеміцкіх выступленняў у 1937 г. дырэкцыя іешывы Тора Хэсэд у Брэсце (рабіны І. В. Салавейчык, І. Х. Каплан) звярнулася да яўрэяў свету з просьбай аб матэрыяльнай падтрымцы[57].

У гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі дзейнічалі шматлікія кнігарні, бібліятэкі, чытальні, якія ўтрымліваліся яўрэйскімі партыямі, культурна-асветніцкімі арганізацыямі, сінагогамі, прыватнымі асобамі. Яўрэйскае насельніцтва мела магчымасць чытаць разнастайныя мясцовыя перыядычныя выданні пераважна на ідыш, а таксама іўрыце і польскай мове[58].

У духоўным жыцці яўрэйскага насельніцтва заходнебеларускіх

[55] Царызм у сярэдзіне – другой палове XIX ст. тройчы закрываў іешыву ў Валожыне. Пасля закрыцця ў 1892 г. з Валожына былі высланы ўсе навучэнцы і выкладчыкі. Аднак з канца XIX – пачатку XX ст. гэтая навучальная ўстанова ізноў узнавіла працу, была папулярнай у асяроддзі артадаксальных яўрэйскіх колаў. Іешыву ў Валожыне ведалі далёка за межамі Еўропы. Менавіта там вучыўся „яўрэйскі Купала" – паэт Хайм Нахман Бялік (Э. Іофэ, *Яўрэі Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", nr 23, Białystok 2005, s. 137-147).

[56] ДАГВ, ф. 56, воп. 1, спр. 132, арк. 19.

[57] B. Łętocha, A. Messer, A. Cała, *Żydowskie druki ulotne w II Rzeczypospolitej w zbiorach Biblioteki Narodowej*, t. I, Warszawa 2004, s. 102.

[58] Паводле В. Каранеўскай, у заходнебеларускіх гарадах выходзіла не менш 60 яўрэйскіх рэгіянальных перыядычных выданняў – пераважна на ідыш (О. Кореневская, *Еврейская периодическая печать в Западной Беларуси в 1921-1939 гг.*, [у:] *Евреи Беларуси: История и культура*, Минск 2001, вып. VI, с. 130). Яўрэйская бібліяграфія міжваеннага часу ў Польшчы налічвае 1 715 перыядычных выданняў на ідыш, у тым ліку аднадзёнак (*Najnowsze dzieje Żydów w Polsce*..., s. 261).

зямель выключнае месца займала Вільня — Літоўскі Іерусалім (як называлі гэты горад яўрэі Усходняй Еўропы яшчэ з новага часу)[59]. У 1920-1930-я гг. у Вільні дзейнічала больш 100 розных яўрэйскіх грамадскіх арганізацый, таварыстваў. Буйнейшым сусветным цэнтрам культуры ідыш стаў Яўрэйскі навуковы інстытут (ЯНІ) (Jidiszer Wissenszaftlecher Institut — JIWO), які быў створаны там у 1925 г. Сярод заснавальнікаў ЯНІ былі прадстаўнікі свецкай ідышамоўнай інтэлігенцыі, што сімпатызавала фалькістам, сацыялістам М. Вайнрайх, З. Рэйзен, І. Чэрніхаў і іншыя. У 1927-1933 гг. у склад кіраўніцтва ЯНІ ўваходзілі таксама ўрач Ц. Шабад, заснавальнік Бунда А. Крэмер, кнігавыдавец Б. Клецкін і іншыя[60]. Асноўнымі мэтамі ЯНІ былі наступныя: адлюстраванне любых праяваў жыцця яўрэяў, вывучэнне з дапамогай новых метадаў іх мінулага і іншыя[61]. Даследаванні разгортваліся ў 4-х секцыях — філалагічнай, гістарычнай, эканамічна-статыстычнай і педагагічна-псіхалагічнай. Дзейнасць асобных камісій была даволі выніковай: было сабрана каля 100 тыс. адзінак яўрэйскага фальклору, больш 25 тыс. асобных выразаў ідыш, некалькі соцень камплектаў тэрміналогіі. Даследаванні праводзіліся пераважна на Віленшчыне — у Вільні, Ашмянскім, Браслаўскім, Дзісенскім і іншых паветах. Галоўную палявую працу ажыццяўлялі збіральнікі (замлэрс).

Са студзеня 1931 г. на ідыш пачаў выдавацца штомесячнік „JI-

[59] Аб культурным жыцці яўрэяў Вільні ў міжваенны час гл.: *Wilno i Ziemia Wileńska: Zarys monograficzny*, t. 1, Wilno 1930, ss. 334, il.; Г. Аграновский, И. Гузенберг, *Литовский Иерусалим: Краткий путеводитель по памятным местам еврейской истории и культуры в Вильнюсе*, Вильнюс 1992, сс. 71, [4], 8 л. ил.: ил.; *Wilno i Wileńszczyzna jako krajobraz i środowisko wielu kultur: Materiały I Międzynarodowej Konferencji*, Białystok 21-24 IX 1989: w 4 t., t. 1, pod red. E. Feliksiak, Białystok 1992, ss. 322; *Wilno i kresy północno-wschodnie: Materiały II Międzynarodowej Konferencji w Białymstoku 14-17 IX 1994 r.*: w 4 t., t. 1: *Historia i ludzkie losy*, pod red. E. Feliksiak i A. Mironowicza, Białystok 1996, ss. 399; t. 2: *Kultura i trwanie*, pod red. E. Feliksiak i A. Kisielewskiej, Białystok 1996, ss. 531; Э. Іофэ, *Роля Вільні ў культурным жыцці беларускіх яўрэяў (XVIII – першая палова XX ст.)*, „Нацыянальныя меншасці на Беларусі і ў свеце: Штоквартальны інфармацыйна-навуковы часопіс. Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей", Брэст 1997, с. 32-35; *Rola mniejszości narodowych w kulturze i oświacie polskiej w latach 1700-1939*, pod red. A. Bilewicz i S. Walasek, Wrocław 1998, ss. 378; Šubas Mejeris, *Vilniaus žydų cultūra tarp dviejų pasaulinių Karų*, [y:] *Vilniaus cultūrinis gyvenimas (1900-1940)*, Vilnius, 1998, s. 137-140; H. Minczeles, *Vilna, Wilno, Vilnius. La Jerusalem de Lituanie*, Paris 2000, p. 495: ill., tabl.; J. Wołkonowski, *Stosunki polsko-żydowskie w Wilnie i na Wileńszczyźnie 1919-1939*, Białystok 2004, ss. 463, [8] s. tabl. i інш.

[60] ЦДАЛ, ф. 53, воп. 23, спр. 2150, арк. 74, 116 -120, 121-124.

[61] *Żydowski Instytut Naukowy (JIWO), jego cele i dorobki*, T-wo Przyjaciół Żyd. Inst. Nauk., 2-e wyd., uzupełn., Wilno 1931, s. 3.

WO-Bleter" („Веснік ЯНІ"), дзе змяшчаліся артыкулы па яўрэйскай гісторыі, сацыялогіі, псіхалогіі, літаратуры, музыцы, выяўленчаму мастацтву і іншыя. Акрамя секцый, разгарнуў працу бібліяграфічны цэнтр, архіў, бібліятэка і музей. У сярэдзіне 1930-х гг. бібліяграфічны цэнтр меў на ўліку больш чым 200 тыс. розных адзінак, бібліятэка налічвала звыш 40 тыс. адзінак. Архіў ЯНІ, які быў створаны ў 1926 г., налічваў тады некалькі тысяч рукапісаў, аўтографаў, каля 100 тыс. плакатаў, лістовак, справаздач, статутаў, каля 10 тыс. экземпляраў перыядычных выданняў[62]. Там збіраліся дакументальныя матэрыялы і з розных мясцін Заходняй Беларусі. Так, таварыства сяброў ЯНІ накіравала 31 жніўня 1928 г. ліст на адрас рэлігійнай абшчыны ў Гродне, дзе прасіла прысылаць дакументы ў архіў[63].

Была створана не толькі ў Польшчы, але і за мяжой разгалінаваная сетка аддзелаў Таварыства прыяцеляў ЯНІ. Інстытут падтрымліваў да пачатку 1930-х гг. навуковыя сувязі з яўрэйскім сектарам Інбелкульта (потым Беларускай акадэміі навук), БДУ і іншымі ўстановамі БССР. За першыя 2 гады дзейнасці ЯНІ яго прыбытак складаў 20,5 тыс. злотых, з якіх 11,6 тыс. злотых паступілі ад розных амерыканскіх арганізацый і прыватных асоб. За перыяд 1925-1934 гг. прыбытак ЯНІ склаў 582 тыс. злотых, з якіх толькі 104 тыс. паступілі ад яўрэяў Польшчы, 248,3 тыс. злотых — з замежных краін, найперш ЗША[64]. У 1927/1928 гаспадарчым годзе да падтрымкі далучыліся мясцовыя яўрэўскія рэлігійныя гміны. З Вільні паступіла 3 тыс. злотых, з Беластока — 300, Гродна — 1 тыс., Ліды — 300, Глыбокага — 50. У 1928/1929 г. дапамога пайшла і з органаў мясцовага самакіравання. У пераліку гарадоў і мястэчак фігуруюць Вільня (3 тыс. злотых), Беласток (1 тыс. злотых), Гродна, Ліда, Пінск, Слонім, Крынкі, Ваўкавыск, Баранавічы, Брэст, Глыбокае, Ашмяны, Стоўбцы, Пружаны, Высока-Літоўск[65]. Аднак сабраных сродкаў не хапала для правядзення даследаванняў, таму даводзілася спадзявацца на замежную дапамогу, якая таксама запаволілася пад уплывам міжнароднага эканамічнага крызісу. Інстытут ажыццяўляў міжнароднае супрацоўніцтва, меў свае аддзелы за мяжой — у Берліне, Варшаве, Нью-Йорку[66].

[62] *Żydowski Instytut Naukowy (JIWO): Rzut oka na jego cele i dorobek,* Wilno 1937, s. 8.
[63] ДАГВ, ф. 56, воп. 1, спр. 54.
[64] *Żydowski Instytut Naukowy (JIWO): Rzut oka na jego cele i dorobek...*, s. 19.
[65] Там жа, с. 7-9.
[66] У Нью-Йорк пасля Другой сусветнай вайны трапіла вывезеная нямецка-фашысцкімі акупантамі калекцыя з Вільні. Зараз у бібліятэцы Яўрэйскага навуковага інстытута ў Нью-Йорку захоўваецца і „віленская калекцыя" (каля 40 тыс. тамоў на ідыш, а таксама на іўрыце, рускай, польскай і іншых мовах), таксама частка архіўных дакументаў (В. Зайка, *Інстытут Гэбрайскіх*

Акрамя згаданага інстытута, свой уклад у культурнае жыццё ў Вільні ўнеслі яўрэйскае гісторыка-этнаграфічнае таварыства, музей, школа мастацкіх рамёстваў. Разам з іншымі прадстаўнікамі яўрэйскай інтэлігенцыі Ц. Шабад быў сярод арганізатараў гісторыка-этнаграфічнага таварыства яўрэйскай археалогіі, якое потым пачало называцца гісторыка-этнаграфічным таварыствам імя С. Анскага[67]. Пры гэтым таварыстве дзейнічаў музей, які ўзнік яшчэ ў 1913 г. Летам 1934 г. там захоўвалася больш 2 тыс. экспанатаў. Сярод каштоўных рарытэтаў былі пергаментныя граматы каралёў Рэчы Паспалітай, прадметы рэлігійнага культу, іконы, палотны, творы разьбы (у тым ліку некалькі помнікаў М. Антакольскага), партрэты, фатаграфіі яўрэйскіх дзеячаў[68].

З 1923 г. у Вільні штогод наладжваліся выставы яўрэйскіх мастакоў. Плённа працавалі ў Вільні Б. Цукерман, Б. Залкінд, М. Ляйбоўскі і іншыя жывапісцы. З 1922 г. у Вільні дзейнічала Таварыства падтрымкі яўрэйскага мастацтва[69]. Таварыства мела асобныя секцыі — літаратуры, музыкі, опернага і пластычнага мастацтваў. Менавіта гэтае таварыства з'яўлялася ініцыятарам стварэння ў канцы 1924 г. Яўрэйскага музычнага інстытута (кансерваторыі)[70]. Гэта была фактычна адзіная кансерваторыя ў Еўропе з выкладаннем на ідыш, якая заваявала вялікую папулярнасць далёка па-за межамі Польшчы. Пашанай карысталіся не толькі дырэктар Яўрэйскага музычнага інстытута Р. Рубінштэйн, які быў таленавітым піяністам, але і выкладчыкі фартэпіяна і вакалу Т. Гіршовіч, Ф. Крэвер, Х. Дугоўская, Э. Ігдал, Ю. Кружанка і іншыя. Тэматычныя музычныя вечары, публічныя канцэрты знаходзілі добрыя водгукі ў віленскага грамадства. У 1932 г. І. Герштэйн заснаваў хор ВілБІГ, якім апекавалася Таварыства падтрымкі яўрэйскага мастацтва. Рэпертуар хора ВілБІГ уключаў творы заходнееўрапейскіх, рускіх, польскіх кампазітараў, яўрэйскія народныя песні, рэлігійныя песні. Калектыў выступаў з канцэртамі не толькі ў Вільні, але і па ўсёй Віленшчыне. У Вільні былі створаны яўрэйскі драматычны тэатр, Саюз яўрэйскіх акцёраў. Самабытнымі пастаноўкамі вылучаўся тэатр марыянетак „Майдзім". У лютым 1926 г. быў адкрыты Яўрэй-

*Досьледаў ІВО ў Нью Ёрку і матэрыялы ў ягоных зборах, зьвязаныя з гісторыяй Беларусі*, „Запісы БІНіМ", № 26). Большасць уцалелых у Вільні архіўных дакументаў знаходзіцца ў ЦДАЛ (ф. 287), частка – у Дзяржаўным яўрэйскім музеі Літвы.

[67] ЦДАЛ, ф. 53, воп. 23, спр. 1491, арк. 40.

[68] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей: БДАМЛіМ), ф. 3, воп. 1, спр. 12, арк. 5.

[69] ЦДАЛ, ф. 53, воп. 23, спр. 1616, арк. 24-25.

[70] Там жа, арк. 21.

скі народны тэатр[71]. У 1935 г. у Вільні ўжо працавалі 15 яўрэйскіх тэатральных калектываў. Напярэдадні Другой сусветнай вайны была распачата кампанія будаўніцтва буйнога яўрэйскага тэатра.

У цэлым, польская дзяржава не здолела забяспечыць яўрэйскаму насельніцтву асвету на ідыш ці іўрыце. Таму яўрэям-літвакам даводзілася ствараць навучальныя ўстановы за свой кошт. Культурна-асветніцкія арганізацыі (ЦЯША, Культур-Ліга, Шуль-Культ і іншыя) займаліся не толькі адкрыццём і ўтрыманнем школ, бібліятэк, але і правядзеннем лекцыйнай работы, падтрымкай аматарскага мастацкага руху. Свецкая тэндэнцыя ў культуры ідыш не стала тады дамінуючай, хоць і паказала сваю паспяховую выніковасць на прыкладзе навукі і асветы Вільні. Яўрэйскія ўстановы адукацыі і культуры захоўвалі нацыянальна-рэлігійную накіраванасць, што спрыяла захаванню самабытнасці яўрэяў і супрацьдзейнічала іх асіміляцыі.

**Streszczenie**

Językiem ojczystym Żydów zamieszkujących zachodnie rejony Białorusi, tzw. litwaków, był jidysz. Posługiwano się nim w życiu codziennym, w procesie edukacyjnym i działalności kulturalnej. Po I wojnie światowej Żydzi-litwacy zostali rozdzieleni granicami państwowymi i znaleźli się w granicach Polski, Litwy, Łotwy i Białorusi Radzieckiej. W województwach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej, zdominowanych przez ludność białoruską, liczba Żydów sięgała 375 tys. W latach dwudziestych utworzyli oni sieć towarzystw kulturalno-oświatowych, które stały się wkrótce ośrodkami oddziaływania Bundu. Najbardziej wpływowa Centralna Żydowska Organizacja Szkolna zorganizowała setki szkół, w których propagowano świeckie zasady wychowania, idee socjalistyczne oraz przywiązanie do żydowskich wartości narodowych. Nieco odmienną koncepcję wychowania propagował syjonistyczny Związek Szkolny i Kulturalny. W placówkach oświatowych zorganizowanych przez Związek skupiano się na przekazywaniu wiedzy o judaikach. Konkurencję dla żydowskich organizacji socjalistycznych i syjonistycznych stanowili komuniści żydowscy skupieni w KPZB, którzy próbowali tworzyć własną strukturę edukacyjną. Odmienny charakter kształcenia posiadały szkoły religijne – chedery, Talmud-tory i jeszyboty, gdzie podstawową lekturę stanowiły *Biblia* i *Talmud.*

[71] Там жа, спр. 2177, арк. 236.